# Сінтаксіс
# і
# пунктуацыя

## Сказы
## з параўнальнымі
## зваротамі

**Сутнасць усякага парўнання заключаецца ў супастаўленні прадметаў, з'яў і ўдакладненні зместу слоў ці словазлучэнняў у сказе.**

**Самай пашыранай формай выражэння параўнання ў беларускай мове з'яўляецца параўнальны зварот.**

**З дапамогай параўнальнага зварота выказваюцца адносіны да таго, што параўноўваецца, бачанне агульнага і прыватнага ў жывой і нежывой прыродзе, вобразная характатыстыка прадмета, з'явы, грамадскага жыцця.**

**Агульнасць прымет, якасцей, дзеянняў, характэрных для таго, што параўноваецца, збліжае параўнальныя адносіны з адносінамі аднароднасці.**

**Галоўным паказчыкам наяўнасці ў сказе параўнальнага звароту з'яўляецца лексічная суаднесенасць слоў, якія абазначаюць факты рэчаіснасці:**

***Бярозкі, як маладыя дзяўчаты ў вяночках, упрыгожваюць школьныя забудовы, сам выгляд школы. (І. Грамовіч)***

**Параўнальнымі зваротамі называюцца словы і словазлучэнні, якія шляхам параўнання раскрываюць і ўдакладняюць змест усяго выказвання або пэўнага члена сказа і ўключаюцца ў сказ пры дапамозе злучнікаў *як, нібы, бы, быццам, як быццам, што, усё роўна як, усё роўна што, як бы* і інш.**

**У склад параўнальных зваротаў можа ўваходзіць адно самастойнае слова *(назоўнік, лічэбнік, прыслоўе, дзеяслоў) ці сплучэнне слоў*:**
***Мокры водар белага бэзу, кветкі-гроны, як вінаград, ветрык весні, ветрык-гарэза ўсё трасе і тузае сад. (У. Караткевіч)***
***Раска, як русалчына луска, на вадзе ад месяца гарыць. (У. Караткевіч)***
***І вось на галінках гараць яблыкі, быццам чырвонагрудыя зяблікі. (М. Танк)***

**Параўнальнымі зваротамі не лічацца фразеалагізмы, якія ў сказе выконваюць функцыю акалічнасці:**
***[Паўлінка:] Што ж гэта, пан Адольф, надуўся як мыш на крупы або як апошняе ў печ усыпаўшы. (Я. Купала)***

**Не з'яўляюцца параўнальнымі зваротамі і словы са злучнікам *як*, што ўваходзяць у склад выказніка:**
***У гэтыя хвіліны яна для яго як маці. (І. Навуменка)***

**Параўнальныя звароты паводле сэнсу**

**Вобразныя**

Супастаўляюцца два прадметныя паняцці. Асновай такіх параўнанняў становяцца падобныя ці блізкія прыметы прадметаў. Такія звароты вельмі часта ўжываюцца ў мове мастацкіх твораў:

***Бы загарпунены кіт, сейнер кідаецца ў бакі. (Р. Барадулін)***

***Анямелы ад страху, бледны як палатно, паплёўся Грыша з салдатам. (Я. Колас)***

**Параўнальна-раўналежныя**

Не маюць метафарычнасці, падкрэсліваюць адпаведнасць прымет або дзеянняў:

***Нідзе так лёгка не дыхаецца, як у лесе. (Я. Маўр)***

***Як заўсёды, цягнік прыбыў на станцыю па графіку. (М. Лынькоў)***

Параўнальна-раўналежныя звароты не могуць звязвацца злучнікамі ***нібы, бы, нібыта*** і інш.

Гэтыя звароты не могуць мець мадальнага значэння, таму што не выражаюць умоўнасці або меркавання.

**Параўнальныя звароты могуць выконваць у сказе функцыю:**

**акалічнасці:**
*Возера невымернай глыбіні, як іртуць, паблісквае ў гарах. (А. Звонак)*

**выказніка:**
*Вочы – нібы дзве чарэшні ў дождж. (А . Карпюк)*

**азначэння:**
*Маладая шышка на елцы зробіцца такой, нібыта грэбень пеўня. (А. Бялевіч)*

**прыдатка:**
*Як пастух, паўночны вецер падганяе ключ гусей. (М. Хведаровіч)*

# Параўнальныя звароты

## Неразвітыя

- **назоўнік** → *Каля гумна стаяць, як вежы, стагі саломы і кармоў. (Я. Колас)*
- **прыметнік** → *Снег пад нагамі скрыпіць, як жывы. (З. Бядуля)*
- **займеннік** → *Асцярога і асцярожнасць ужо іх прытаміла, як і мяне. (Ф. Янкоўскі)*
- **дзеяслоў** → *Мы свае ім пелі песні, як маглі. (П. Панчанка)*
- **прыслоўе** → *Ён хутка, нібы спалохана, абапіраецца рукамі на голле і ўстае. (А. Кулакоўскі)*

## Развітыя

**назоўнік і залежныя ад яго слоў іншых часцін мовы**

*Ільны такія белыя – **што лебядзіны пух**. (М. Калачынскі)*
*Белыя бярозы дымяцца, **як няцэджаны сырадой**. (Р. Барадулін)*

**Параўнальныя звароты могуць паясняць любы член сказа:**

*Я памяць сваю, **нібы кнігу**, гартаю. (А Астрэйка) (выказнік)*
*Раніцамі вясна  сее, **як брыльянты**, росы. (Я. Купала) (дапаўненне)*

На пісьме **параўнальныя звароты** звычайна выдзяляюцца коскамі. Зрэдку параўнальныя звароты могуць аддзяляцца працяжнікамі для таго, каб больш выразна паказаць, да якой часткі сказа яны адносяцца, ці з асаблівай сілай падкрэсліць характар параўнання.

## Параўнальныя звароты не адасабляюцца:

- калі яны з'яўляюцца выказнікам або ўваходзяць у склад выказніка:
  *Вада ў рацэ нібы набрыняла свінцом. (Т. Хадкевіч)*
- калі яны ўваходзяць у склад устойлівых (фразеалагічных) словазлучэнняў:
  *Ян маўчаў. Сядзеў як аршын праглынуўшы. (Л. Арабей)*
- калі абедзве часткі параўнання выражаны адным і тым жа словам:
  *Дуб стаіць як і стаяў. (В. Вольскі)*
- калі злучнік як звязвае неадасоблены прыдатак з паясняемым назоўнікам ці займеннікам:
  *Чмаруцьку ведалі ўсе як чалавека з вялікай фантазіяй. (М. Лынькоў)*
  Параўнальны зварот тут ужыты са значэннем "у якасці".
- калі перад параўнальным зваротам стаяць часціцы ***не (ні), амаль,*** прыслоўе ***зусім*** і некаторыя размеркавальныя злучнікі:
  *Вада была зусім як летняя. (В. Вольскі)*